**Л.І.Ракавецкая,** *кандыдат педагагічных навук*

# ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

У сістэме бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі важнае месца займаюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў. Гэта складаная комплексная сістэма, накіраваная на актуалізацыю, удасканаленне, пашырэнне і паглыбленне прафесійных ведаў бібліятэчных кадраў у адпаведнасці з дасягненнямі навукі, набыццё сучасных тэарэтычных і практычных навыкаў для адаптацыі персаналу бібліятэкі да зменлівых сацыяльных і вытворчых умоў.

У Беларусі склалася і стабільна функцыянуе сістэма павышэння кваліфікацыі, пабудаваная на прынцыпах абавязковасці, планавасці і бесперапыннасці, якая мае свае задачы, мэты і формы. Яе галоўнае прызначэнне – на аснове базавай падрыхтоўкі, атрыманай у навучальных установах, падымаць на больш высокі ўзровень кваліфікацыю бібліятэчных работнікаў, стымуляваць іх прафесійную творчасць.

Павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў ажыццяўляюць Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў(ІПКіПК) – структурнае падраздзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, – інстытуты павышэння кваліфікацыі розных міністэрстваў і ведамстваў і бібліятэкі – метадычныя цэнтры.

ІПКіПК у асноўным ажыццяўляе павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў публічных бібліятэк рэспублікі ў форме каротка-тэрміновых (1–2 тыдні) курсаў. Тэматыка курсаў прысвячаецца канкрэтнай праблеме і арыентавана на вузкае кола спецыялістаў. Інстытут з'яўляецца цэнтрам бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі.

Арыентацыя на атрыманне новых ведаў, асабліва ў галіне асваення інфармацыйных тэхналогій і іншых сучасных напрамкаў, – адзін з перспектыўных шляхоў развіцця не толькі сістэмы павышэння кваліфікацыі, але і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

Распрацаваная ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры (з 2007 г. – ІПКіПК) (згодна з рашэннем калегіі Міністэрства культуры ад 29.10.1998 г. № 9, п. 1) мадэль перападрыхтоўкі спецыялістаў публічных бібліятэк па авалоданні камп'ютэрнай тэхнікай і новымі тэхналогіямі з'явілася пэўным станоўчым зрухам у бок актуалізацыі навучання бібліятэчных кадраў ва ўмовах сучасных інфармацыйных тэхналогій. Дадзеная мадэль прадугледжвае навучанне чатырох катэгорый бібліятэчных работнікаў:

– кіраўнікоў ЦБС (цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм) – дырэктараў, намеснікаў дырэктараў);
– бібліятэчных спецыялістаў;
– тэхнолагаў і адміністратараў БД;
– групы суправаджэння АБІС (інжынер, інжынер-праграміст, электроншчык).

Мэта перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў – асваенне новых прафесійных ведаў пры пераходзе на новую пасаду, на іншы ўчастак бібліятэчнай работы, у сувязі з укараненнем новых аўтаматызаваных тэхналогій. Перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў – гэта самы танны, хуткі і мэтазгодны спосаб атрымання профільнай адукацыі работнікаў бібліятэк. Але, у сваю чаргу, сістэма перападрыхтоўкі сама патрабуе рашэння складаных праблем:

– вывучэння матываў перападрыхтоўкі, якімі кіруюцца навучэнцы;
– падбору высокакваліфікаваных выкладчыкаў;
– удасканалення сістэмы стажыровак у краіне і за мяжой;
– праграмна-інфармацыйнага і навукова-метадычнага забеспячэння перападрыхтоўкі;
– пошуку і пашырэння формаў арганізацыі працы на камерцыйнай аснове.

Удасканаленне сістэмы перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў сягоння патрабуе вызначыць прыярытэтныя арыенціры ў галіне прафесійнай адукацыі адпаведна міжнародным патрабаванням да гэтага віду дзейнасці.

У дакуменце Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (ІФЛА) запісана: "Весці работу па падрыхтоўцы міжнароднай эквівалентнасці і ўзаемапрызнання кваліфікацыі бібліятэкараў" [2]. У стандарце ІФЛА [4] дадзены 18 крытэрыяў, якія прад'яўляюцца да бібліятэчнай адукацыі на сучасным этапе.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Таму перападрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў, ужо маючых вышэйшую адукацыю і жадаючых атрымаць прафесійную падрыхтоўку ў галіне бібліятэчнай справы, неабходна весці па вучэбных праграмах з улікам патрабаванняў міжнароднага стандарта ІФЛА па бібліятэчнай адукацыі. Усе курсы павінны адлюстроўваць міжнародны ўзровень развіцця дадзенай галіны.

Вядучыя бібліятэкі рэспублікі і бібліятэкі – метадычныя цэнтры – таксама самастойна арганізуюць павышэнне кваліфікацыі для сваіх супрацоўнікаў у форме кароткатэрміновых курсаў, навукова-практычных канферэнцый, семінараў, школ дырэктараў і інш.

Сучасны стан грамадства фарміруе патрэбу ў павышэнні кваліфікацыі, узроўню кампетэнтнасці спецыяліста бібліятэкі. Таму адукацыйны працэс павінен быць скіраваны на ўнутраную матывацыю навучэнцаў, іх асобасны рост у кірунку самапазнання, самаразвіцця і самарэгуляцыі. Пры дапамозе самаадукацыі бібліятэчныя работнікі паглыбляюць і папаўняюць раней атрыманыя веды ў адпаведнасці са зменамі, што адбываюцца ў тэорыі і практыцы бібліятэчнай справы, а таксама з улікам патрабаванняў канкрэтных абставін. Кіраўнікі бібліятэк павінны садзейнічаць прафесійнай адукацыі персаналу.

Эфектыўнай формай работы з кадрамі зарэкамендавалі сябе школы, якія праводзяцца на базе многіх цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. З мэтай павышэння кваліфікацыі работнікаў розных катэгорый у бібліятэках – метадычных цэнтрах – арганізуюцца школы бібліятэкара, бібліёграфа, кіраўніка, бібліятэчнага псіхолага і інш.

Школы ў Беларусі праводзяцца не толькі на базе ЦБС, але на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях.

У маі 2006 г. камітэт па кадрах Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі (ББА) сумесна з бібліятэкай БДУ і бібліятэкай БДУ культуры і мастацтваў арганізаваў рэспубліканскую школу дырэктара "Мастацтва эфектыўнага кіравання". Навучанне праходзіла ў рэжыме нон-стоп. Рабочая праграма ўключала наступныя адукацыйныя формы: лекцыі-прэзентацыі, творчую майстэрню, псіхалагічны трэнінг, дзелавыя гульні.

У Беларусі праводзяцца і школы міжнароднага ўзроўню. Пад эгідай ББА ў лютым 2005г. праходзіла III Міжнародная зімняя школа "Актуальныя праблемы бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі", накіраваная на павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў бібліятэчна-інфармацыйных дысцыплін [3].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У кастрычніку 2007 г. у г. Пскове і г.Мінску праходзіла Міжнародная школа-семінар “Менеджмент якасці ў бібліятэчнай дзейнасці”. У школе якасці, акрамя лекцый, былі прапанаваны дзелавыя гульні, трэнінг-семінары, работа ў малых групах па тэматыцы заняткаў. Гэта дазволіла праз дзейнасць асобных бібліятэчных работнікаў – навучэнцаў падобных школ – увесці параметры еўрапейскіх стандартаў якасці ў бібліятэчныя сеткі рэгіёнаў і асваенне бібліятэчнай дзейнасці.

Інфармацыйныя тэхналогіі і магчымасць выкарыстання камп’ютэрных сетак сувязі зрабілі ўплыў і на сістэму павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў. З’явіліся новыя формы яе арганізацыі, у ліку якіх найперш неабходна назваць тэлеканферэнцыі. Яны прадугледжваюць тэматычны абмен інфармацыяй паміж карыстальнікамі, правядзенне групавых дыскусій. Новы напрамак у павышэнні кваліфікацыі кадраў – распрацоўка і правядзенне курсаў дыстанцыйнага навучання карыстальнікаў сеткі Інтэрнет. Такую форму павышэння кваліфікацыі выкарыстоўвае Магілёўская абласная бібліятэка [1].

Асноўныя рысы работы па павышэнні кваліфікацыі кадраў – інтэграванасць, актуальнасць праблематыкі праграм навучання, пераключэнне на актыўныя формы і ўкараненне новых. Да новых формаў навучання адносяцца трэнінгі, бібліятэчныя дайджэсты і анонсы, дзелавыя гульні, бібліятэчны бартэр. Неабходна адзначыць і такую форму навучання, як майстар-класы. Мэтай навучання тут ставіцца індывідуальная работа з навучэнцам, пры гэтым забяспечваецца актыўны ўдзел аўдыторыі ў вучэбным працэсе. Прыкладам такой формы навучання можа служыць Дрыбінская ЦБС, дзе распрацавалі “Майстар-клас для сельскіх калег” і Ваўкавыская ЦБС, якая праводзіла майстар-клас “Навігацыя ў Інтэрнеце”.

Сучасны тэмп і рытм жыцця ўплываюць на ўсе сферы дзейнасці, не выключэнне і бесперапынная бібліятэчная адукацыя, асаблівасцю якой на сучасным этапе з’яўляецца інавацыйнасць. Сёння патрэбны новы прафесіянал, здольны працаваць творча, нестандартна. Трафарэты ўжо не спрацоўваюць, творчая праца патрабуе высокай культуры, інавацыйнага мыслення, здольнасці пастаянна і крытычна аналізаваць эфектыўнасць сваёй працы. Таму асноўнай задачай павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў павінна быць развіццё творчых адносін да справы, а не проста трансляцыя новай інфармацыі. Спецыялісты

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўпэўнены, што толькі аб'яднанне класічнай бібліятэчнай адукацыі з інавацыйнымі формамі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў дасць найлепшыя вынікі.


*1. Андронава, А.У.* Сістэма павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: традыцыі і інавацыі / А.У.Андронава // Бібліятэка прапануе. – 2006. – № 5. – С. 22–24.

*2. Международная* федерация библиотечных ассоциаций и учреждений: среднесрочная программа на 1992–1997 гг. – Гаага, 1993. – 84 с.

*3. Стрелкова, И.Б.* III Международная зимняя школа: традиции и инновации / И.Б.Стрелкова // Бібліятэчны свет. – 2005. – № 3. – С. 27–30.

*4. Standards* for Library Schools IFLA. – Haague, 1994.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ